# Лета



# ЛЕТНІЯ СВЯТЫ:

## Купалле

**Адзін з галоўных святаў календара, які супадае з Ражством Іаана Хрысціцеля.**

**Іван Купала з'яўляецца адным з самых ушанаваных дзён у беларусаў. Купалле – сапраўднае язычніцкае свята ў гонар летняга сонцастаяння. Падчас летняга сонцастаяння росквіт прыроды дасягае свайго апагею: каласуе на палях пшаніца, грэчка, проса, заквітнелі лён і бульба, скончыўся прыплод у жывёл. Таму нашы продкі ў гэтыя дні імкнуліся аддзячыць Матухне-Прыродзе.**

**Яшчэ з раніцы дзяўчаты і жанчыны з песнямі накіроўваліся ў поле, на сенажаць збіраць купальскую траву. Па народных павер'ях, спеў песень падчас збору гаючай травы перадаваў ім лекавую і цудадзейную моц.**

**Важнае значэнне надавалася агню, менавіта купальскі агонь з'яўляўся магічным, абарончым сродкам. На купальскім вогнішчы спальвалі старыя рэчы, гэта сімвалізавала абнаўленне жыцця. Скокі хлопцаў і дзяўчат праз вогнішча – гэта таксама імкненне да абнаўлення.**

**Дзяўчаты займаліся варажбой: апускалі вянкі ў раку і сачылі за іх рухам.**

**Галоўны цуд Купалля – дзіўная легенда пра кветку папараці, якая спарўдзіць усе жаданні ўладальніка.**

**Ёсць павер'е, што ў купальскую ноч праводзяць гулі чараўнікі і ведзьмы. Гаспадары дзеля аховы сваёй хаты вешалі над уваходам вострыя прадметы.**

**З наступленнем раніцы моладзь купалася ў рэках, каталася па свежай расе, сустракала ўзыход сонца, у гонар якога і святкавалася Купалле.**



# Жніво

**Жніво ўяўляе сабой працяглы комплекс абрадаў і рытуалаў – ад Зажынак да Дажынак і восеньскага Багача. Магло працягвацца ад 12 ліпеня да 27 верасня.**

**Жніво – гэта вяршыня гаспадарчай дзейнасці земляроба. Хлеб быў святыняй для сялян, і да ўборкі яго з поля прыступалі з пачуццём асаблівай адказнасці і святасці. У пярэдадзень жніва вымывалі хату, бялілі печ, засцілалі стол новым белым абрусам, выпраўляліся зажынаць у белам чыстым адзенні. Толькі чыстымі рукамі і з чыстым сэрцам можна брацца за адказную працу.**

**Жніво пачыналася з агляду гаспадаром свайго поля ў апошні раз. Затым адбываўся рытуал “пакрыцця поля”. Зранку на Зажынкі маладзіца, што нядаўна выйшла замуж і прыйшла жыць у новую сям’ю, з дзяўчатамі нажынала першы сноп, абвязвала яго наміткай ці ручніком. Падкідаючы сноп угору, дзяўчаты з маладой жанчынай вадзілі карагоды, спявалі.**

**Гаспадыня з дочкамі ішла на поле, віталася з ім: “Добры дзень, ніўка, ядраное жыта!” Першай зжатай жменяй каласоў старэйшая жняя падпяразвалася, потым нажыналі сноп, які часта называлі гаспадаром, прыпісвалі яму магічныя здольнасці, усяк ушаноўвалі: ставілі на покуці, зерне з яго дамешвалі ў насенне для азімай сяўбы. Сноп-гаспадар быў у цэнтры зажынкавых песень.**

**У дзень Зажынак у хаце была святочная вячэра, спявалі жартоўныя песні, прыпеўкі, але разыходзіліся рана, бо трэба было на досвітку ісці на сапраўднае жніво. Яго пачыналі са словамі: “Працаваць усім жадаем, з новым хлебам усіх віншуем, каб у добрую пару жніво пачаці і ў добрае надвор’е скончыць.” У час Жніва спявалі працяжныя песні, часцей за ўсё ідучы дамоў: “А ў нашага пана”, “Ой пара дамоў, пара”, “Сонейка нізенька, вечарок блізенька”.**

**Шмат абрадаў было ў апошні дзень Жніва – Дажынкі. У гэты дзень дажынаць жыта ў гаспадара збіралася жаночая талака. Самы распаўсюджаны абрад быў “завіванне барады” – зжынанне апошніх нязжатых каласоў і рытуальна магічныя дзеянні з сярпамі. Перад тым, як зжаць “куст-бараду” (апошняе жыта), кожная жанчына павінна была пакачацца па ім, каб на другі год быў добры ўраджай. Тады “завівалі бараду”.**

**“Завіваць бараду” азначала скручваць жгутам, згінаць, надаваць круглую форму. Абрад павінен быў забяспечыць добры ўраджай на будучы год.**



# Ілля

2 жніўня – свята старазапаветнага прарока Іллі, апекуна земляробства і абаронцы ад нячыстай сілы. Прарок жыў у Ізраільскім царстве ў IX стагоддзі да Раства Хрыстова.

Лічыцца, што Ілья быў дбайным змагаром чыстай веры і рэзка выступаў супраць ідалапаклонства і бязбожнасці.

Ільін дзень успрымаўся як канец лета і пачатак восені, аб чым сведчаць прыказкі: "Ілля жніво пачынае, а лета канчае", "На Іллю да абеда лета, а пасля абеда восень", "Ілля нарабіў гнілля", "Прыйшоў Пятрок - сарваў лісток, прыйшоў Ілля - сарваў два".

Жнівеньскія дажджы і бясконцыя маланкі ў народзе называліся "арабінавымі" ("рабінавымі") начамі і пачыналіся са свята Іллі. Дзень паступова рабіўся карацейшым, таму познім летам казалі: "Ілля-прарок дзве гадзіны звалок", "З Іллі працаўніку дзве ўгоды: ноч доўгая ды вада халодная". Маланкі на свята Іллі лічыліся лекавымі, а дажджавую ваду ў гэты дзень сяляне збіралі, каб мыцца ёю

Ілля – заступнік грому, нябеснага агню, дажджу. На Ільін дзень прынята было не выганяць жывёлу на пашу – яе магла заспець навальніца ці град, нязменныя спадарожнікі прарока.

Калі на Ільін дзень ідзе дождж, гэта лічыцца добрай прыкметай: будзе ўраджай у наступным годзе, а таксама дождж змые грахі і благія думкі.

У дзень святога Іллі забаранялася працаваць – за парушэнне забароны разгневаны прарок мог спаліць маланкай селішча, пабіць градам поле або пакараць засухай і сухавеямі.

Раніцай жа ў Ільін дзень неабходна памыцца расой. Пасля Іллі забаранялася купацца ў рэках і азёрах. Казалі: "Ілля ільдзінку ў ваду ўкінуў". А яшчэ верылі, што гэтай парой чэрці хаваюцца ад стрэлаў прарока Іллі ў ваду і могуць зацягнуць чалавека на дно.



# Прыказкі і прымаўкі пра лета:

### Чэрвень

Чэрвень не гуляе - ураджай люляе.
Чэрвень сухі - плюнь на баравікі.

### Ліпень

Ліпень пякучы, але даручы.
Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае.

### Жнівень

Кожная хата ў жніўні багата.
Што ў полі ўродзіць, жнівень знаходзіць.

# Прыкметы лета:

**Калі 1 і 2 чэрвеня лье дождж – увесь чэрвень будзе сухі.**

**Спахмурнела неба, а кветкі дзьмухаўцоў раскрытыя – дажджу не будзе.**

**Вялікі гром – маленькі дождж.**

**Сарока пад страху лезе – перад ветрам, навальніцаю.**

**Глухі гром – да ціхага дажджу, рэзкі – да ліўня.**

**На агонь кастра ляціць многа машкары – надвор’е пагоршыцца.**

**Добра цвіце рабіна – ураджай на лён.**

**Мноства ягад летам прадвяшчае халодную зіму.**

**Відаць многа павукоў – на добрае надвор’е.**

# Чытаем дзецям:



**Ніна Галіноўская «Лета»**

У сукенцы каляровай,
У хусцінцы васільковай
Ходзіць лета па палях,
Па расквечаных лугах.

Звоніць песняй жаўруковай
Кожны дзень званчэйшай, новай.
Дбайна сонечнае лета
Спеліць ягады для дзетак.

Любіць з імі забаўляцца.
Загараць, спяваць, купацца.
Дораць дзеці лету ўсмешкі,
Гульні, песні і пацешкі.
А расчуленае лета
Дорыць ім букеты кветак.



**Якуб Колас «Летам»**

Ну ж і волі, волі
У гаі за вёскай!
А цяплынь, цяплынь!
Весела на полі,
Слаўна пад бярозкай,
Хоць ты сядзь спачынь.

Пчолкі, матылёчкі,
Як сняжынкі тыя,
Мільгацяць вакол.
Жоўтыя пясочкі –
Крупкі залатыя,
Хоць бяры ў прыпол.